# ТЭКСТАВАЯ АКТУАЛІЗАЦЫЯ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ НЕЛАГІЗМАЎ

***Лугоўская Т. У.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– І. М. Мацвеенка, выкладчык*

Кантэкст фарміруе семантычную структуру індывідуальна-аўтарскага неалагізма. Узуальныя словы, якія дапамагаюць праясніць словаўтваральную і семантычную структуру аказіяналізма, называюцца актуалізатарамі. Р. Намітокава сістэмазавала ўсе выпадкі актуалізацыі аказіяналізма і размежавала актуалізацыю лексічнай адзінкай у тэксце (лексічныя актуалізатары) і актуалізацыю зместам тэксту (тэкставыя актуалізатары)
[1, с. 23].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Непасрэдныя тэкставыя актуалізатары падзяляюцца на графічныя (незвычайнае напісанне слова) і інтэрпрэтатары (аўтар паясняе сэнс аказіяналізма). Напрыклад, агаліць унутраную форму слова *сілас-офія* дапамагае яго напісанне праз злучок: *У крыкліўца свая філасофія, А ў каровы свая* ***сілас-офія****: Будзе сілас, дык дам малака* (К. Камейша). У кантэксце таксама прысутнічае слова *філасофія*, па аналогіі з якім і ўтварыўся аказіяналізм: *сілас-офія ← сілас + філасофія.* Так утвараецца каламбур: *сілас-офія* – гэта філасофія каровы. Слова *ЛеГальна* на слых успрымаецца як узуальнае *легальна* ('па закону'). Аднак напісанне слова сведчыць пра тое, што гэта аказіяналізм, утвораны ад абрэвіятуры *ЛеГал*. Сам аўтар паясняе, хто гэта, у пачатку верша: *ЛеГал* (Леанід Галубовіч). Значыць, *ЛеГальна* – гэта па Леаніду Галубовічу: *Аднак законна ўсё,* ***ЛеГальна*** *– Няма ў тым справы крымінальнай* (П. Саковіч). У гэтым прыкладзе спалучаюцца графічная і інпрэтуючая актуалізацыі. Інтэрпрэтацыя семантыкі наватвораў адбываецца і ў наступных прыкладах: ***Лісеем****, брат,* ***лісеем*** ***(лісеем** ад слова "ліс")* (А. Вярцінскі); *З цялячай радасцю ў кароўнік Бег* ***алканаўт*** *Сухі Кузьма (Чытач, не варта лезці ў слоўнік – Такога слова там няма). Пра* ***алканаўтаў*** *я зазначу, Маўчыць, як рыба, слоўнік наш. Таму адразу растлумачу, Што гэта тое, што алкаш* (У. Ермалаеў).

Такім чынам, пры тэкставай актуалізацыі праясніць семантыку індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў дапамагае кантэкст. Кантэкст можа непасрэдна (з дапамогай спецыяльных памет) указваць на структуру аказіяналізма, а можа самім зместам дапамагаць праясненню значэння новаўтварэння.

**Літаратура**

1 Намитокова, Р. Ю. Авторские новообразования: структура и функционирование (на материале современной поэзии): автореф. дис. ... д-ра филол. наук: 10.02.01 / Р. Ю. Намитокова, Адыгейский гос. пед. ин-т. – Майкоп, 1989. – 33 л.

2 Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка. – Мінск: БелЭн, 1996. – 784 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина